Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

28 ЛЮТАГА 2008 г. ЧАЦВЕР

№ 39 (26152)

Кошт 430 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

## У Беларусі пачата падрыхтоўка да святкавання 65-годдзя вызвалення краіны і Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне

**Прэзідэнт Беларусі зацвердзіў склад Рэспубліканскага арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 65-й гадавіны вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне, а таксама Палажэнне аб аргкамітэце і план падрыхтоўкі і правядзення мерапрыемстваў па святкаванні дзвюх гістарычных дат. Адпаведны ўказ кіраўнік дзяржавы падпісаў 25 лютага.**

Старшынёй аргкамітэта назначаны прэм'ер-міністр Беларусі Сяргей Сідорскі. У план уключаны агульнарэспубліканскія і рэгіянальныя ўрачыста-святочныя мерапрыемствы з нагоды святкавання дзвюх вялікіх дат (ваенныя парады, урачыстыя сходы, святочныя канцэрты, тэатралізаваныя паказы і іншыя), мерапрыемствы, накіраваныя на паляпшэнне сацыяльна-эканамічных умоў жыцця інвалідаў і ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны, рамонт і добраўпарадкаванне помнікаў і мемарыялаў, вывучэнне і прапаганду сусветна-гістарычнага значэння вызвалення Беларусі і Перамогі, патрыятычнае выхаванне грамадзян (навуковыя канферэнцыі, фестывалі, конкурсы, выстаўкі, спартыўныя спаборніцтвы, ваенна-спартыўныя гульні і іншыя), развіццё міжнароднага супрацоўніцтва ў гэтым напрамку. Планам таксама прадугледжана шырокае асвятленне ў сродках масавай інфармацыі ўсёй работы па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання вызвалення Беларусі і Перамогі.

Урад, аблвыканкамы і Мінскі гарвыканкам павінны забяспечыць выдзяленне ў 2009 і 2010 гадах бюджэтных сродкаў на падрыхтоўку і правядзенне ўрачыстасцей, прысвечаных указаным мерапрыемствам. Рэспубліканскім і мясцовым дзяржаўным органам даручана аказаць садзейнічанне аргкамітэту ў яго рабоце, у ажыццяўленні каардынацыі дзейнасці ўсіх зацікаўленых дзяржаўных структур і грамадскіх арганізацый па святкаванні гэтых дат, а таксама прыняць неабходныя меры па аказанні дапамогі ветэранам Вялікай Айчыннай вайны ў вырашэнні пытанняў сацыяльнай абароны.

Прыняцце ўказа дасць магчымасць на высокім узроўні адзначыць дзве важныя гістарычныя даты, будзе садзейнічаць яшчэ большаму згуртаванню і яднанню беларускага народа, патрыятычнаму выхаванню грамадзян.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

### А на мой погляд...

## Жыць стала зручней. Хоць бываюць і іншыя выпадкі...

**Як хутка (у адпаведнасці з вызначанымі тэрмінамі) вырашаліся вашы асабістыя пытанні пры звароце ў розныя інстанцыі? Ці сутыкаліся вы апошнім часам з фактамі бюракратызму? Ці даводзілася вам карыстацца паслугамі «Аднаго акна»? Як у вашым калектыве вырашаецца пытанне дэбюракратызацыі?**

***Пётр ПРУДНІКАЎ, галоўны інжынер ахоўнага эксплуатацыйнага ўнітарнага прадпрыемства Мінгарвыканкама «Гаражы, аўтастаянкі і паркоўкі»:***

— У нас на прадпрыемстве распрацаваны спецыяльны кодэкс паводзінаў супрацоўнікаў пры зносінах з кліентам. Галоўная думка ў ім — кліент заўсёды мае рацыю, і наша задача — максімальна задаволіць яго пажаданні па любым пытанні ў межах уласнай кампетэнцыі.

Калі гаварыць пра асабістае, мне даводзілася звяртацца па пытаннях, звязаных са службовым жыллём, у адміністрацыю Маскоўскага раёна. Прычым на мяжы вызначаных для падачы заявы тэрмінаў. І служба «Аднаго акна» спрацавала вельмі дакладна, хутка, карэктна ў дачыненні да мяне. У выніку на ўсю працэдуру пайшло нашмат менш часу, чым я першапачаткова разлічваў.

***Эма ТРАФІМІК, эканаміст па збыце Свіслацкага філіяла камунальнага ўнітарнага прадпрыемства па забеспячэнні палівам «Гроднааблпаліва»:***

— У асабістым жыцці з такімі праблемамі я апошнім часам не сутыкалася. Што да працы, дык у нас з сельскімі Саветамі заключана спецыяльная дамова наконт выдачы даведак. Яны — аб складзе сям'і — патрэбны пры абслугоўванні льготных катэгорый насельніцтва. Самі ведаеце, гэта, як правіла, састарэлыя людзі. Дык мы патрэбныя звесткі або самі забіраем з сельсаветаў, або яны іх нам дасылаюць.

***Аляксандр ШОКАЛЬ, дзяржінспектар Лідскай міжраённай інспекцыі аховы жывёльнага і расліннага свету:***

— Пытанні зразумеў. Асаблівых праблем не ўзнікае. Вадзіцельскія правы ў ДАІ пераафармляў — за 15 хвілін усё зрабілі. Па лініі жыллёва-камунальнай гаспадаркі, калі звяртаўся наконт рамонту, таксама ўсё было наладжана, усё выконвалася. У банку, калі крэдыт афармляў, праўда, шмат папер давялося збіраць, але, відавочна, так трэба. Зараз, гавораць, вадзіцелям медкамісію прайсці складана — шмат людзей. Я, праўда, прайшоў, яе раней.

***Іосіф КАСІЛО, пенсіянер з вёскі Данілавічы Дзятлаўскага раёна:***

— У нас тут праблема на 14 сем'яў — з вадой. Летась прарвала водаправод: раз, другі. Адрамантавалі яго таксама раз, другі. А потым... Камунальнікі сказалі паставіць лічыльнікі. Паставілі, а вады ўсё роўна няма. Звярталіся ў сельскі Савет, прыязджаў да нас нейкі начальнік з райвыканкама, абяцаў нешта, ды што з таго?

***Людміла і Канстанцін ДРОЗД, вёска Леткаўшчына Слуцкага раёна:***

— Мы ўзялі ў арэнду гектар зямлі. Вырошчваем на ёй памідоры, капусту, іншую вітамінную прадукцыю. Зарабляем такім чынам на жыццё. Захацелі ўзяць яшчэ два гектары. Калі атрымаецца, ноймем трактар, сваякі дапамогуць апрацоўваць зямлю. Быццам бы ніякіх праблем з сельсаветам не ўзнікла: зямлю гатовы даць, парушэнняў тут няма. У раёне адзін з начальнікаў таксама гэта нам пацвердзіў. Праблема ўзнікла з-за землекарыстальніка, які прыязджае да нас па серадах. Маўляў, вы ўсё вырашайце: і са старшынёй, і з сельсаветам, рыхтуйце паперы, а я потым подпіс пастаўлю. На працягу месяца муж тройчы падыходзіў да яго з гэтай праблемай, фактычна прасіў, каб чалавек выканаў свае службовыя абавязкі. Апошні раз ён адправіў нас па вядомым адрасе, маўляў, надакучылі...

***Таццяна МАЛЯЎКА, галоўны спецыяліст аддзела дзяржкантролю за выкарыстаннем і аховай расліннага свету, лясоў і ландшафтаў Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя:***

— У маёй сям'і звярталіся ў колішняе БТІ па пытаннях нерухомасці, у названае вамі «Адно акно». Усе пытанні вырашылі даволі хутка. Вадзіцельскую даведку атрымала ва ўстаноўленыя тэрміны.

Калі гаварыць пра сітуацыю ўвогуле, адзначу наступнае. Бываючы па розных пытаннях у іншых дзяржаўных установах і арганізацыях, я бачу, што паўсюдна ёсць служба «Аднаго акна», на бачных месцах размешчана патрэбная наведвальнікам інфармацыя: да каго, па якіх пытаннях і калі трэба звяртацца, якія дакументы патрэбны, іх узоры. Тое ж магу сказаць і пра сваё міністэрства, дзе таксама ўсё наладжана, усё дакладна арганізавана. Вельмі добра, што ў розных арганізацыях змянілі час падачы наведвальнікамі дакументаў, зрабілі яго больш зручным, скажам, перанеслі на вечар. Раней трэба было нейкім чынам дамаўляцца на працы, каб падчас працоўнага дня ўкласціся ў вызначаныя гадзіны. А ўвогуле скажу, што нават пры такой паслузе, як «Адно акно», чалавеку ўсё роўна трэба прыкласці хоць бы мінімум намаганняў, каб справа зрушылася з месца. Сама па сабе яна не вырашыцца.

**Сяргей СТАРЫНАЎ.**




Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**Таццяна ТАПАРКОВА — адна з вядомых народных майстроў Магілёўшчыны, прадаўжальніца «саламянай» справы сваёй маці-майстрыхі. Цяпер — выкладчык па мастацкай саломе і роспісу першай у Беларусі дзіцячай школе мастацкіх рамёстваў у Горках. А яшчэ Таццяна Данілаўна кіруе дзіцячай студыяй «Чарадзейка», якая носіць ганаровае званне «народная». Гэтыя мадэлі адзення — як спроба стылізацыі славянскай культуры, створаны рукамі яе вучняў.**

Абітурыент-2008

## ПРАФАДБОР: ЭСЭ ПЛЮС ТЭСТ НА ІНТЭЛЕКТ?

**Як паведамляла раней «Звязда», сёлета для паступлення на спецыяльнасці «дзяржаўнае кіраванне», «дзяржаўнае кіраванне і права», «дзяржаўнае кіраванне і эканоміка», «міжнародныя адносіны», «міжнароднае права», «правазнаўства», «эканамічнае права», «журналістыка», «міжнародная журналістыка» і «мытная справа» абітурыентам давядзецца прайсці папярэдні прафесійны адбор. І хоць унесеныя ў Правілы прыёму ў ВНУ змяненні сталі вядомыя яшчэ тры тыдні таму, палажэнне аб правядзенні прафесійнага тэсціравання або гутаркі ўсё яшчэ не зацверджана. Між іншым, для абітурыентаў сёння любая інфармацыя — на вагу золата...**

**Прыадкрыць таямніцу над механізмам правядзення прафесійнага адбору пагадзіўся ў гутарцы з журналістамі рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Васіль СТРАЖАЎ:**

— Паводле нашага меркавання, не трэба нічога выдумляць. Можна скарыстацца амерыканскім вопытам. Ва ўсіх вядучых амерыканскіх універсітэтах маладыя людзі на ўваходзе ў ВНУ пішуць эсэ. Дапусцім, малады чалавек плануе паступаць на факультэт журналістыкі БДУ. У сваім эсэ ён павінен будзе паведаміць, якімі матывамі ён кіруецца, як ён бачыць сябе ў будучай прафесіі, чаму абраў для навучання менавіта Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт. Абітурыенту трэба будзе праявіць сваю самастойнасць і спеласць меркаванняў, — патлумачыў сваю думку Васіль Стражаў. — Гэта, так бы мовіць, сачыненне на прафесійную тэму, чаму я хачу быць журналістам або юрыстам. Але мы не збіраемся яго ацэньваць на адзнаку: яно або прымаецца, або не прымаецца, залік ці не залік. Плюс пры паступленні абітурыенты павінны праходзіць таксама тэсціраванне на агульнае развіццё. Падобнае тэсціраванне ўжо шмат гадоў паспяхова праводзіць пры адборы навучэнцаў Ліцэй БДУ. Ліцэйскія тэсты — добра адшліфаваныя, і іх можна хоць сёння браць і прымяняць. Ніякія складаныя задачы ў тэсты, што ацэньваюць агульнае інтэлектуальнае развіццё маладых людзей, уключацца не будуць. І адзнакі за тэсты выстаўляцца таксама не будуць.

На пытанне, а як жа «экзаменатары» змогуць беспамылкова ацаніць, хто прыклаў руку да напісання эсэ (толькі абітурыент або яго настаўнікі, бацькі, рэпетытары), ці тэкст для эсэ ўвогуле быў знойдзены ў Інтэрнэце, Васіль Стражаў адказаў наступнае: «Па-першае, Інтэрнэт таксама знаходзіцца ў полі нашай увагі, а па-другое, я не бачу ніякіх праблем, каб вызначыць аўтарства сачыненняў на прафесійную тэму, бо рука дарослага чалавека заўсёды бачная. Дарэчы, у амерыканскіх універсітэтах абітурыенту могуць адмовіць увогуле без тлумачэння прычыны».

Але Беларусь, дзе на кожнае бюджэтнае месца прэтэндуюць па 3 чалавекі, усё ж такі не Амерыка, і, напэўна, механізм і крытэрыі прафесійнага адбору павінны быць зразумелымі абсалютна для ўсіх. Як і прычына, па якой маладога чалавека прымусяць адмовіцца ад сваёй мары яшчэ да старту галоўных экзаменацыйных выпрабаванняў. Між іншым, Васіль Стражаў прызнаўся, што для аб'ектыўнасці ажыццяўлення прафесійнага адбору вельмі важнае значэнне будзе мець адзінства падыходаў, паколькі прайсці прафесійнае тэсціраванне можна будзе ў любой ВНУ, дзе рыхтуюць спецыялістаў па згаданых вышэй спецыяльнасцях, у тым ліку і на базе прыватных ВНУ. І далей накіроўвацца з атрыманым дазволам на «штурм» любой вышэйшай навучальнай установы.

— Праўда, мы добра разумеем, што асноўная нагрузка па правядзенні прафесійнага адбору кладзецца ўсё ж такі на БДУ, таму што пераважная большасць пазначаных у правілах прыёму спецыяльнасцяў знаходзяцца менавіта ў нашым універсітэце, — дадаў Васіль Стражаў. — Таму і настойваем на пісьмовай форме прафесійнага адбору. Адначасова мы можам забяспечыць пасадачнымі месцамі да трох тысяч чалавек. Рабіць мы гэта будзем, зразумела, у адзін з выхадных дзён, каб не зрываць адукацыйны працэс у навучальных установах.

На пытанне журналіста «Звязды», а ці давядзецца праходзіць аналагічны прафесійны адбор абітурыентам, якія паступаюць у Юрыдычны каледж БДУ, Васіль Стражаў адказаў, што гэта было б лагічным, але спачатку новы механізм трэба будзе апрабаваць, тым больш што ў «правілах прыёму абітурыенты сярэдніх спецыяльных навучальных устаноў пакуль што не ўзгадваюцца».

Першы намеснік міністра адукацыі Аляксандр Жук дадаў, што доўгачаканы дакумент з'явіцца ўжо на наступным тыдні і будзе дадзены да ведама ўсіх вышэйшых навучальных устаноў і абітурыентаў. Рэгістрацыя для ўдзелу ў прафесійным тэсціраванні будзе праходзіць у сакавіку, а сам адбор — у красавіку, яшчэ да рэгістрацыі для ўдзелу ў цэнтралізаваным тэсціраванні. Такім чынам у абітурыентаў, якім на прафадборы па нейкай прычыне не пашанцуе, будзе магчымасць, каб пераарыентавацца ў выбары прафесіі, і, адпаведна, у выбары дысцыплін для здачы на цэнтралізаваным тэсціраванні. І дадаў, што праходзіць прафесійны адбор давядзецца толькі грамадзянам Беларусі і асобам, якія пастаянна пражываюць на тэрыторыі нашай краіны. Ні на грамадзян Расіі, ні на прадстаўнікоў іншых замежных дзяржаў гэты парадак не распаўсюджваецца...

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## $351,4 — сярэдняя зарплата ў студзені

Паводле апошніх звестак Міністэрства эканомікі Беларусі, сярэднямесячная зарплата работнікаў у цэлым па рэспубліцы за першы месяц гэтага года павялічылася ў параўнанні з леташнім студзенем на 21,6 працэнта і склала 756,3 тысячы рублёў, альбо 351,4 долара ЗША. У бюджэтнай сферы намінальная сярэднямесячная зарплата ў студзені склала 634,3 тысячы рублёў, ці 294,7 долара і павялічылася да студзеня 2007 года на 15,7 працэнта. На гэты год прадугледжваецца, што сярэднямесячная зарплата работнікам народнай гаспадаркі да канца года будзе даведзена да ўзроўню, эквівалентнаму 400 долараў ЗША.

**Ігар ГРЫШЫН.**

## РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### РЫБАЛОВАМ — ЗАБАРОНА, ПАЛЯЎНІЧЫМ — ДАЗВОЛ

**З 1 па 31 сакавіка, згодна з Правіламі вядзення рыбалоўнай гаспадаркі і рыбалоўства, у краіне будзе забаронена лоўля шчупака. А забарона на лоўлю ментуза, якая дзейнічала з 25 снежня, наадварот, заканчваецца ў канцы лютага.**

Да другой суботы сакавіка паляванне забаронена, можна здабываць толькі дзікіх жывёлін непажаданых відаў (у парадку, устаноўленым Правіламі). З 8 сакавіка пачнецца паляванне на пералётных гусей.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**

### $6000 — АД НАРКАДЗЯЛКА

**У Мінску затрыманы 39-гадовы непрацуючы жыхар сталіцы.**

Паводле звестак аддзела інфармацыі і грамадскіх сувязяў ГУУС Мінгарвыканкама, супрацоўнікі падраздзялення наркакантролю і супрацьдзеяння гандлю людзьмі сталіцы знайшлі ў наркадзялка 400 грамаў амфетаміну і 300 грамаў марыхуаны, якія ён меў намер збыць. Па месцы жыхарства затрыманага, у адной з кватэр па вуліцы Прытыцкага, канфіскавана буйная сума валюты — каля 6000 долараў ЗША.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### АБВІНАВАЧВАНЫ Ў ЗАБОЙСТВЕ ІРЫНЫ КУЖЭЛЬНАЙ ПРЫЗНАНЫ БЕССВЯДОМЫМ

Аб гэтым паведамілі ў прэс-службе пракуратуры Мінскай вобласці. Псіхолага-псіхіятрычная экспертыза прызнала бессвядомым мінчаніна, затрыманага па падазрэнні ў забойстве 7-гадовай лагойскай школьніцы, праінфармавалі ў прэс-службе. Пасля расследавання матэрыялы крымінальнай справы будуць перададзены ў суд для прымянення да яго мераў бяспекі і прымусовага лячэння.

**Кар. БЕЛТА.**

### ЗАЧАПІЛА ПЛІТОЙ

**У цэнтры Брэста пры разборцы 14-га паверха недабудаванай гасцініцы загінуў супрацоўнік гарадскога аддзела па надзвычайных сітуацыях.**

Гэты злашчасны гмах пачалі будаваць да Алімпіяды-80, але не скончылі. Потым кожны з мэраў горада спрабаваў неяк вырашыць лёс даўгабуда, але нікому гэта не ўдавалася. Некалькі гадоў таму іранская фірма ўзялася перарабіць гасцініцу ў шматфункцыянальны комплекс. Абласное ўпраўленне МНС, якое мае ліцэнзію на падобныя работы, прыступіла да дэмантажу верхніх паверхаў. 22-гадовага выратавальніка зачапіла бетоннай плітой, якую паднімаў кран, і знесла на балкон двума паверхамі ніжэй. Ад атрыманых траўмаў хлопец памёр на месцы. Гэты даўгабуд мае нядобрую славу ў гараджан. Тут знаходзілі замерзлых бамжоў, ахвяраў злачынстваў, тых, хто рашаўся звесці рахункі з жыццём.

**Яна СВЕТАВА.**

### МІНЮСТ БЕЛАРУСІ МАЕ НАМЕР УПАРАДКАВАЦЬ АКАЗАННЕ ПСІХАЛАГІЧНАЙ ДАПАМОГІ

**«Размова ідзе аб тым, каб упарадкаваць работу парапсіхолагаў, людзей, якія здымаюць сурокі і чары, усялякіх знахараў», — заявіў журналістам міністр юстыцыі Віктар Галаванаў.**

«Мы не спрабуем забараняць гэтыя віды дзейнасці, але ў гэтай галіне дзейнічае многа махляроў», — растлумачыў ён.

### ТЭЛЕМОСТ З ВАТЫКАНАМ

Тэлемост пад назвай «Еўропа і Амерыка разам для пабудовы цывілізацыі любові» 1 сакавіка будзе доўжыцца каля дзвюх гадзін, беларускае ўключэнне запланавана на тры хвіліны. Мерапрыемства пачнецца ў 18.00. Сігнал з мінскага Архікафедральнага касцёла Прасвятой Дзевы Марыі па спадарожніку будзе перадавацца ў ватыканскі тэлецэнтр. Зваротны сігнал з Ватыкана ў Беларусь будуць прымаць 8 плазменных і 1 святлодыёдны экраны, устаноўленыя ўнутры і каля касцёла. Аб гэтым паведаміў Архіепіскап Мітрапаліт Мінска-Магілёўскі Тадэвуш Кандрусевіч.

**БЕЛТА.**


## БЕЛИНВЕСТБАНК

## ПОЗДРАВЛЯЕМ ПОБЕДИТЕЛЕЙ!



**ОАО «БЕЛИНВЕСТБАНК» С 1 ДЕКАБРЯ 2007 ГОДА ПО 15 ФЕВРАЛЯ 2008 ГОДА ПРОВОДИЛ РЕКЛАМНУЮ ИГРУ «ОПЛАТИ КАРТОЧКОЙ ОАО «БЕЛИНВЕСТБАНК» И ВЫИГРАЙ ПРИЗ».**

Это мероприятие было призвано повысить интерес граждан республики к карточным продуктам, увеличить объем безналичных платежей.

Банковские пластиковые карточки — удобная альтернатива традиционным платежным инструментам.

С использованием карточек можно не только снять наличные и рассчитаться за товары и услуги в магазинах и сервисных предприятиях, но и провести коммунальные и другие безналичные платежи, услуги операторов мобильной связи, Интернет-провайдеров и другие.

**ОПРЕДЕЛЕНЫ ПОБЕДИТЕЛИ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «ОПЛАТИ КАРТОЧКОЙ ОАО «БЕЛИНВЕСТБАНК» И ВЫИГРАЙ ПРИЗ»:**

**В ПЕРВОЙ НОМИНАЦИИ**

По карточкам международной платежной системы Visa International (с зачислением приза на карт-счет карточки или одной из карточек победителя Игры):

— **первое место** — Мисюкевич Александр Сергеевич (2 млн. бел. рублей);
— **второе место** — Ранчинский Борис Борисович (1,5 млн. бел. рублей);
— **третье место** — Жваник Елена Ивановна (1 млн. бел. рублей);
— **четвертое место** — Воротницкий Юрий Иосифович (0,5 млн. бел. рублей);
— **пятое место** — Горбушин Илья Анатольевич (0,25 млн. бел. рублей).



**ВО ВТОРОЙ НОМИНАЦИИ**

По карточкам международной платежной системы MasterCard International (с зачислением приза на карт-счет карточки или одной из карточек победителя Игры):

— **первое место** — Завиновский Иван Иванович (2 млн. бел. рублей);
— **второе место** — Борисевич Сергей Аркадьевич (1,5 млн. бел. рублей);
— **третье место** — Белов Вадим Валерьевич (1 млн. бел. рублей);
— **четвертое место** — Корота Ольга Алексеевна (0,5 млн. бел. рублей);
— **пятое место** — Мороз Алексей Николаевич (0,25 млн. бел. рублей).

**В ТРЕТЬЕЙ НОМИНАЦИИ**

По карточкам платежной системы «БелКарт» (с зачислением приза на карт-счет карточки или одной из карточек победителя Игры):

— **первое место** — Тукай Николай Александрович (2 млн. бел. рублей);
— **второе место** — Ваулина Альдона Веславовна (1,5 млн. бел. рублей);
— **третье место** — Вуглер Александр Владимирович (1 млн. бел. рублей);
— **четвертое место** — Стрельцова Ольга Ивановна (0,5 млн. бел. рублей);
— **пятое место** — Поздняков Андрей Яковлевич (0,25 млн. бел. рублей).

Вручение денежных призов производится посредством их зачисления на карт-счет карточки или одной из карточек победителя Игры, выпущенной ОАО «Белинвестбанк». В случае истечения срока действия карточки или закрытия карт-счета выдача карточки соответствующей платежной системы осуществляется при наличии паспорта или иного документа, удостоверяющего личность, в Центральном офисе банка по адресу: **220002, г. Минск, пр. Машерова, 29**, а также в региональных филиалах ОАО «Белинвестбанк» по следующим адресам:

**224030, г. Брест, ул. Советская, 50, тел. (8-0162) 23-08-36**
**210015, г. Витебск, ул. Ленина, 22/16, тел. (8-0212) 29-75-01**
**246050, г. Гомель, ул. Советская, 7, тел. (8-0232) 74-11-45**
**230023, г. Гродно, ул. Мицкевича, 3, тел. (8-0152) 72-02-13**
**212030, г. Могилев, ул. Первомайская, 29-а, тел. (8-0222) 22-03-35.**

**Телефоны для справок: (017) 239-01-72, 289-36-76**
**www.belinvestbank.by**

*Открытое акционерное общество "Белорусский банк развития и реконструкции "Белинвестбанк".*
*Лицензия Национального банка Республики Беларусь на осуществление банковской деятельности № 3 от 27.10.2006 г.*
*Свидетельство о государственной регистрации правил проведения рекламной игры № 878, зарегистрировано Министерством торговли Республики Беларусь 16.11.2007 г. УНП 807000028*


## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### ПРЭЗІДЭНТ ЛАТВІІ АДЧЫТАЎ КІРАЎНІКА МУС ЗА АБРАЗУ АНГЛІЧАН

**Прэзідэнт Латвіі Валдзіс Затлерс у сваім выступленні па нацыянальным радыё адчытаў міністра ўнутраных спраў Марэка Сегліньша за тое, што той назваў брытанскіх турыстаў свіннямі, пасля таго як адзін з іх памачыўся на помнік Волі ў цэнтры Рыгі.**

Нагадаем, віноўнік нядаўняга інцыдэнту — англійскі турыст — быў асуджаны рыжскім судом да пяці сутак адміністрацыйнага арышту. Раней у латвійскай сталіцы неаднаразова фіксаваліся ідэнтычныя парушэнні з удзелам брытанцаў, аднак парушальнікі парадку звычайна абыходзіліся штрафам.

### КІРГІЗЫ АБВЯСЦІЛІ КОНКУРС НА ЛЕПШУЮ ПЕСНЮ СУПРАЦЬ АМЕРЫКАНСКАЙ ВАЕННАЙ БАЗЫ

**Кіргізскі Фонд імя Сергія Раданежскага і Манаса Вялікадушнага арганізаваў конкурс на лепшую песню, накіраваную супраць амерыканскай авіябазы «Манас».**

Узнагарода аўтару лепшай песні складзе, па розных дадзеных, ад 200 да 1000 долараў ЗША. У канцы лютага 2008 года ўлады Кіргізіі паабяцалі вывесці ваенную базу ЗША з тэрыторыі краіны.

### ЭСКІМОСЫ ПАДАЛІ Ў СУД НА ЭНЕРГЕТЫКАЎ ЗА ГЛАБАЛЬНАЕ ПАЦЯПЛЕННЕ

**Жыхары рыбацкага пасёлкаКіваліна на поўначы Аляскі падалі ў суд на два дзесяткі найбуйнейшых амерыканскіх энергетычных кампаній.**

Эскімосы патрабуюць ад энергетыкаў пакрыць шкоду ад глабальнага пацяплення, з-за якога арктычныя штармы руйнуюць іх пасёлак, размешчаны на вузкай рыфавай выспе. Рыбакі сцвярджаюць, што павышэнне сярэднегадавой тэмпературы ў Арктыцы прывяло да знікнення сезонных леднікоў, якія абараняюць рыф ад зімовых штармоў. Цяпер падчас бур арктычныя хвалі хвошчуць прама па пабудовах.


## Открытое акционерное общество «Ресторан «Беларус»

**извещает акционеров о том, что 28.03.2008 г. состоится общее собрание акционеров по адресу: г. Минск, ул. Сторожевская, 15а.**

**Начало собрания в 15.00. Ознакомиться с материалами и документами повестки дня можно в дирекции (г. Минск, ул. Сторожевская, 15а, тел. 297 13 13).**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Отчет Наблюдательного совета за 2007 год.
2. Отчет Ревизионной комиссии о проверке финансово-экономической деятельности Общества за 2007 год.
3. Об итогах работы Общества за 2007 год и основные направления деятельности Общества в 2008 г.
4. Об утверждении годового баланса за 2007 г.
5. Об утверждении дивидендов за 2007 г.
6. О распределении чистой прибыли, полученной в 2008 г.
7. Избрание членов Наблюдательного совета.
8. Избрание членов Ревизионной комиссии.
9. Об утверждении условий материального вознаграждения членам Наблюдательного совета и Ревизионной комиссии.
10. О согласовании индексного метода при переоценке основных средств на 01.01.2008 г.

*Регистрация участников собрания с 13.00 до 15.00 28.03.2008 г. по месту проведения собрания акционеров. Для регистрации при себе иметь документ, удостоверяющий личность (представителям акционеров — доверенность, заверенную в Комитете по ценным бумагам при Совете Министров РБ).*

УНП 100055804


ISSN 1990 - 763X

### КУРСЫ ВАЛЮТ

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 28.02.2008 г. (для б/н разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 147,00 |
| 1 еўра | 3 232,31 |
| 1 латвійскі лат | 4 640,66 |
| 1 літоўскі літ | 936,10 |
| 1 чэшская крона | 129,09 |
| 1 польскі злоты | 912,96 |
| 1 расійскі рубель | 88,73 |
| 1 украінская грыўня | 424,25 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў*

Цэнтрабанк РФ

| | |
|---|---|
| USD | 24,1966 |
| 10 UAH | 47,4788 |
| 1000 BYR | 11,2641 |
| EUR | 36,3893 |

*Курс у гандлёвых кампаніях (на 27.02.2008 г.)*

| | |
|---|---|
| USD | 2135 / 2210 |

Агенцтва Уладзіміра Граўцова

*Падпішыцеся на часопіс «Главный Бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*

*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Граўцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

